


## Да 90-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

У аддзеле беларускай і краязнаўчай літаратуры разгорнута **выстава-прагляд "Сімвал сучаснай Беларусі"** з нагоды заснавання галоўнай Кніжніцы краіны і Дня бібліятэк.

Народжаная ў 1922 г., вось ужо амаль стагоддзе, Нацыянальная бібліятэка Беларусі трапятліва і самааддана выконвае гуманную місію захавальніцы спадчыны беларускага народа.

Нацыянальная бібліятэка была заснавана ў 1921 г. у складзе Белдзяржуніверсітэта, а ў 1922 г. адкрыта для агульнага карыстання ў якасці Дзяржаўнай. З нагоды свайго 10-годдзя атрымала новы будынак.

У 2002 г. Рашэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь распачалося ўзвядзенне новага будынку НББ, урачыстае адкрыццё якога адбылося 16 чэрвеня 2006 г.

Сёння Нацыянальная бібліятэка – гэта болей 8 млн. адзінак захавання кніг, часопісаў, газет, нот, электронных дакументаў; з найноўшым тэхнічным абсталяваннем і хуткасным інтэрнэтам; з сістэмай фондаў адкрытага доступу.

На выставе прадстаўлены матэрыялы пра Нацыянальнаю бібліятэку, сярод якіх афіцыйныя дакументы, зборнікі прац спецыялістаў установы, шматлікія выданні бібліятэкі, у тым ліку на электронных носьбітах. Шэраг матэрыялаў прысвечаны развіццю і сучаснаму стану бібліятэчнай справы на Беларусі і на Магілёўшчыне ў прыватнасці.

Выстава адрасавана не толькі спецыялістам, але і ўсім, хто цікавіцца вывучэннем гісторыі культуры сваёй Айчыны.

***Выстава будзе працаваць да канца верасня***